View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository



Анатоль Вялікі
Апублікавана: Беларускі гістарычны часопіс. 2015. - №4, С.5-13.
Ключавыя словы: БССР, Чырвоная Армія, Асаавіяхім, вызваленне, размініраванне, размінёры, інструктар-мінер, мінныя палі, міна, снарад, авіябомба.

# Без права на памылку.

Майму бацьку Хведару Вялікаму,
колішняму 16-ці гадоваму размінёру
і ўсім размінёрам Беларусі прысвячаецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вынікам паспяховага асенне-зімовага наступлення Чырвонай арміі ў 1943-1944 гг. стала поўнае ці частковае вызваленне 40 раёнаў Гомельскай. Палесскай, Магілеўскай і Віцебскай абласцей, у тым ліку і двух абласных цэнтраў – Гомеля і Мазыра. На вызваленай тэрыторыі трэба было пачынаць мірнае жыццё – падымаюць з руінаў і папялішчаў прамысловасць і сельскую гаспадарку, рамантаваць ці будаваць новае жыллё, каб перасяліць людзей з зямлянак у дамы, аднаўляць дзейнасць школ і культурных установаў. Адной з надзвычайна сур'езных і важных задач, якая паўстала і перад кіраўніцтвам Савецкага Саюза, і перад партыйна–савецкім кіраўніцтвам Беларусі ў першыя вызваленыя дні, стала задача ачысткі тэрыторыі рэспублікі ад нязлічонай колькасці мін, снарадаў, авіябомб, гранат і іншых небяспечна выбуховых прадметаў, схаваных у беларускай зямлі. Мэтай артыкула з'яўляецца паказ дзейнасці каманд размінёраў Асавіяхіма БССР, якія на працягу красавіка 1944 г – кастрычніка 1946 гг. размініравалі тэрыторыю Беларусі.

Улічваючы той факт, што частка тэрыторыі Беларусі ўжо вызваленая ад нямецкіх захопнікаў Дзяржаўны Камітэт Абароны (ДКА) 19 лютага 1944 г. прымае пастанову, у адпаведнасці з якой на Асавіяхім БССР была ўскладзена задача па размініраванню тэрыторыі Беларусі, пошуку і збору трафейнай зброі. Зыходзячы з гэтага СНК БССР і ЦК КП(б)Б 3 сакавіка 1944 г. прыняў адпаведную пастанову, якая абавязвала партыйна-савецкае кіраўніцтва

абласцей і раёнаў, арганізацыі Асавіяхіма тэрмінова прыступіць да яе выканання.

Заўважым, што партыйна-савецкае кіраўніцтва Беларусі яшчэ задоўга па пастановы ДКА СССР праявіла ініцыятыву і распачало працу па падрыхтоўцы інструктароў і байцоў-размінёраў. Так, у ліпені-жніўні 1943 г. аператыўныя групы абласных камітэтаў КП(б)Б Віцебскай, Магілеўскай, Гомельскай, Палесскай абласцей вылучылі падрыхтаваныя групы інструктараў-размінераў, якія адразу ж пасля вызвалення часткамі Чырвонай Арміі тэрыторыі уваходзілі ў вызваленыя гарады і населенныя пункты, арганізоўвалі агляд і размініраванне будынкаў, а таксама вялі разведку і агароджванне мінных палёў, дарог і інш.[1, арк. 25]. Аднак, яны былі нешматлікімі і не маглі выканаць у поўным аб'ёме пастаўленыя перад імі задачы.

Работу па размініраванню магчыма падзяліць на некалькі этапаў. Першы пачаўся адразу ж пасля пастаноў ДКА СССР, СНК і ЦК КП(б)Б і працягваўся да поўнага вызвалення тэрыторыі рэспублікі. На гэтым этапе праца абцяжарвалася тым, па-першае, што прыходзілася на "маршы" у вызваленых раёнах ствараць структуры Асавіяхіма, якія павінны былі займаца ўсімі пытаннямі размініравання. Па-другое, Асавіяхім БССР не меў вопыта правядзення размініравання ў маштабах рэспублікі, адсутнічала неабходная колькасць падрыхтаваных спецыялістаў і г.д. Гэта задача была вырашана наступнымі шляхамі: 1. Да размініравання прыцягнулі партызан-падрыўнікоў; 2. Частку інструктароў-мінёраў, выдзелілі франты, якія вызвалялі Беларусь ад нямецкіх захопнікаў; 3. Інструктары-размінёры рыхтаваліся пры Цэнтральным Савеце (ЦС) Асавіяхіма ў Маскве; і 4. Пры Цэнтральнай школе Ваенна-службовага сабакаводства (ЦШВСС), якая размяшчалася таксама ў Маскве.

У БССР падрыхтоўка размінераў праводзілася па 300-х гадзіннай праграмме, у якой прадугледжвалася вывучэнне савецкіх і, галоўным чынам, нямецкіх мін розных сістэм, мін-сюрпрызаў, устройства мінных палёў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

абезшкоджванне і падрыў неразарваўшыхся мін, снарадаў, авіябомб, склад выбуховых рэчываў (меленіта, аманала, тола і г.д.), спосабы маскіроўкі немцамі мінных палёў і г.д. [2, арк. 98-100]. Пасля праходжання праграмы размінеры здавалі іспыты, якая прымала дзяржаўная камісія, у склад якой ўваходзілі вопытныя спецыялісты міннай справы і пасля здачы экзаменаў яны адпраўляліся на размініраванне тэрыторыі. У першую чаргу прадугледжвалася праверыць і размініраваць дарогі і палеткі, што было цалкам абгрунтавана. Ішла вясна і трэба было займацца спрадвечнай сялянскай працай – засяваць палеткі, каб восенню атрымаць ўраджай.

Вылучэнне партызан-мінераў у якасці інструктароў было цалкам абгрунтаваным і лагічным крокам. Прыкладам такіх падыходаў з’яўляецца лёс 27-мі гадовага Рыгора Броўчанкі, які з верасня 1943 г. у партызанскім атрадзе “25 год ВЛКСМ” Баранавіцкага партызанскага злучэння, з’яўляўся камандзірам узвода падрыўнікаў і за дыверсійную дзейнасць на камунікацыях праціўніка быў прадстаўлены да ўзнагароды ордэнам “Чырвонай Зоркі”. Адразу ж пасля вызвалення Стаўбцоўскага раёна ён быў прызначаны старшынёй раённага аддзялення Асавіяхіма. Ды вось, яго мінулая баявая дзейнасць, вопыт мінёра-падрыўніка вельмі спатрэбіўся яму ў мірны час. Ён падрыхтаваў 3 каманды размінёраў, галоўным чынам з былых партызан, якія налічвалі 160 чалавек. Пад яго камандаваннем размінёры сабралі і знішчылі ў Стаўбцоўскім раёне 18 750 артылерыйскіх снарадаў, 2676 мін, 620 авіябомб і болей 2 тыс. розных выбуховых прадметаў, размініравалі 3 мінных палі. Асабіста Р. Броўчанка сабраў, абезшкодзіў і знішчыў 4350 артснарадаў, 1760 мін [3, арк. 21].

Калі Р. Броўчанка быў вопытным спецыялістам-размінерам, то ў абсалютнай большасці падрыхтаваныя байцы-размінёры былі звычайнымі падлеткамі, якія зведалі ўсе “асалоды” акупацыі. Так, байцу-размінёру Рыгору Сілічу, жыхару вёскі Крыніца Смялявіцкага раёна ў 1944 г. было ўсяго 16 год. Але ў характарыстыцы, напісанай для прадстаўлення яго да ўзнагароды

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

адзначалася: “ Пасля вызвалення Беларусі ад нямецкіх захопнікаў тов. Сіліч добраахвотна ўступіў у каманду байцоў-размінёраў, па размініраванню Смалявіцкага раёна. […] Толькі пры размініраванні Смялявіцкага раёна т. Сіліч абязшкодзіў і знішчыў 190 супрацьпяхотных, 29 супрацьтанкавых мін. […] За ўзорнае выкананне работы па абезшкоджванню мясцовасці Смалявіцага раёна ад выбухова-небяспечных прадметаў Смалявіцкі райсавет Асавіяхіма просіць абласны савет Асавіяхіма ўзнагародзіць урадавай узнагародай - медалем “За адвагу” [3, арк.27].

Не меньш узорную характарыстыку меў 17-ці гадовы камандзір аддзялення размінёраў, якое размініравала Гродна Міхаіл Ізерскі, у службовай характарыстыцы якога адзначалася: “Пад кіраўніцтвам Ізерскага яго аддзяленне не мела ні воднага няшчаснага выпадку падрыва сярод асабовага склада аддзялення. Т. Ізерскі асабіста размініраваў 4 калодзежы, якія былі замініраваныя ў вадзе. Аддзяленне т. Ізерскага знішчыла 11 312 выбухова-небяспечных прадметаў, а асабіста ён знішчыў 3948 выбуховых адзінак [3, арк.37].

У службовай характарыстыцы 18-ці гадовага ўраджэнца Бабруйска Аляксандра Грыневіча адзначалася: “ У 1944 г. пасля вызвалення Бебруйска город і прылягаючыя да яго тэрыторыі былі забруджаны. Тав. Грыневіч скончыў курсы мінёраў па 300 гадзінай праграме на “выдатна” і пасля пачаў працаваць па ачыстцы г. Бабруйска . За перыяд 1944 г. зняў супрацьтанкавых мін праціўніка – 72, супрацьпяхотных – 21, мін-сюрпрызаў – 20, сабраў і знішчыў артснарадаў рознага калібру 1500, авіябомб – 508, мінамётных мін рознага калібру - 2220. У 1945 г. т. Грыневіч таксама удзельнічаў у размініраванні. У красавіку 1945 г. для Бабруйскага райсавета Асавіяхіма падрыхтаваў каманду ў складзе 21 байца і асабіста кіраваў працай па размініраванню і пад яго кіраўніцтвам сабрана і знішчана 29 624 узрыванебяспечныя адзінкі. У верасні 1945 г. тав. Грыневіч быў камандзіраваны ў адстаючы раён Парычы. Тав. Грыневіч і там сваім асабістым

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прыкладам арганізаваў работу раённай каманды і пад яго кіраўніцвам сабрана і знішчана 12 286 узрыванебяспечных рэчываў. За ўвесь перыяд размініравання не мае надзвычайных выпадкаў (НВ)” [3, арк.51].

Адзначым, што ў абсалютнай большасці размінёры з’яўляліся 16-ці-17-ці гадовымі хлопцамі-беларусамі. Так, на курсах размінёраў Стаўбцоўскага Асавіяхіма ў лістападзе 1944 г. вучыўся 51 чалавек і ўсе яны былі беларусамі 1927 г. нараджэння. Гэта значыла, што ім у 1944 г. было ўсяго па 17 год [4, арк.2-2адв].

Паралельна ішла праца па падрыхтоўцы неабходнай колькасці інструктароў-мінёраў праз Цэнтральны Савет Асавіяхіма ў Маскве, на якіх рыхтаваліся спецыялісты па 4-х месячнай праграме. Акрамя гэтага, інструктароў-мінёраў па 2-х месячнай праграме рыхтавала Цэнтральная школа Ваенна-службовага сабакаводства (ЦШВСС), якая размяшчалася таксама ў Маскве. Пасля яе сканчэння прысвойвалася званне інструктара па размініраванню з прымяненнем сабак. Яе, ў прыватнасці, скончыў Міхаіл Кукарэка, ураджэнец в. Зазеркі Пярэжырскага сельсавета Рудзенскага раёна. У красавіку 1945 г. ён быў прызначаны начальнікам каманды па размініраванню Рудзенскага раёна і падрыхаваў каманду ў колькасці 50 чалавек. Пад яго кіраўніцтвам з красавіка па чэрвень 1945 г. Рудзенскі раён быў поўнасцю ачышчаны ад мін і выбуховых прадметаў. Размінёрамі было праверана 19 796 км$^2$ тэрыторыі раёна, сабрана і знішчана 15 340 снарадаў, мін і іншых выбуховых прадметаў [3, арк.60].

Заўважым, што чацьвераногіх “размінёраў” вельмі шанавалі і цанілі. У “Інструкцыі па прымяненню і падрыхтоўцы сабак мінна-пошукавай службы” адзначалася, што: “падраздзяленні сабак-мінашукальнікаў у цяперашні час з’яўляюцца ў інжынерных войсках каштоўным сродкам для правядзення работ па размініраванню і, у асобных выпадках, прымяненне гэтых сродкаў (гучыць неяк абразліва для сабак. – А. В.), з’яўляецца адзінай гарантыяй у поўнай ачыстцы мясцовасці ад мін на найбольш адказных участках (раёны

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

распалажэння КП воінскіх злучэнняў, асноўныя магістралі, чыгуначныя дарогі і г.д.” [5, арк.60]. Сабакі прымяняліся галоўным чынам пры размініраванні мінных палёў, участкаў, якія былі забруджаны металаломам, абломкамі будаўнічых матэрыялаў, тэрыторый, зарослых кустарнікам і ў тых выпадках, калі прымяненне звычайных сродкаў (мінашукальнікаў, шчупаў, тралаў) было абцяжарана ці ўвогуле немагчымым.

Акрамя гэтага, мясцовыя партыйна-савецкія органы ўлады вялі сярод насельніцтва шырокую растлумачальную работу. Так, напрыклад, у многіх раёнах былі арганізаваны трансляцыі па радыё аб мерах перасцярогі грамадзян на палях, у нежылых будынках, у сельскіх саветах праходзілі сходы грамадзян, на якіх растлумачвалася аб мерах бяспекі, у грамадскіх месцах развешваліся плакаты, лістоўкі, якія папярэджвалі аб небяспецы, перад кіносеансамі ў кінатэатрах [6, арк.67].

Асаблівая ўвага надавалася растлумачальнай працы сярод дзяцей, бо яны былі больш бяспечнымі чым дарослыя. Адзначым, што па дадзеных Асавіяхіма рэспублікі каля 70% падрываў прыходзілася на дзяцей школьнага і дашкольнага ўзросту [7, арк.75]. У сувязі з гэтым, наркам асветы БССР К. Уралава звярнулася да ЦС Асавіяхіма рэспублікі, абл/рай/гаррайна з тым, каб супольнымі мерамі і намаганнямі сістэматычна растлумачваць дзецям небяспеку пакінутых немцамі выбухованебяспечных рэчываў і прадметаў, у школах арганізаваць спецыяльныя “вугалкі” і выстаўкі для нагляднага азнаямлення дзяцей з гэтымі рэчамі і прадметамі, актывізаваць у школах асавіяхімаўскую работу, весці шырокую растлумачальную работу сярод дзяцей і г.д. Безумоўна, гэтая праца прыносіла свой плён і ў поўнай ступені знізіла смяротнасць сярод дзяцей і дарослых.

З дапамогай партызан-мінёраў, ваенных мінёраў да пачатку красавіка 1944 г. было падрыхтавана 106 інструктараў і 1516 байцоў-мінераў, якія склалі першыя 32 раённыя каманды, якія тэрмінова прыступілі да размініравання. Усяго да ліпеня 1944 г. г.зн. да вызвалення Мінска было падрыхтавана 250

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

інструктараў і 2978 байцоў- размінёраў, якія ў гэтых часткова вызваленых абласцях праверылі і ачысцілі 14 533 км$^2$ плошчы, у тым ліку размініравалі 636 мінных палёў, сабралі і знішчылі 563496 выбуховых прадметаў [8, арк. 2]. Найбольшая колькасць выбуховых рэчываў у 1944 г. належыла артылерыйскім снарадам, якіх знайшлі 384 301, супрацьпяхотным мінам – 107 213, супрацьтанкавым – 90 396 і мінамётным – 50 325 [9, арк. 3]. Для падрыва ўсяго гэтага Беларускі Штаб Партызанскага Руху (БШПР) выдзеліў размінерам 15 тыс. капсуляў-дэтанатараў, 3000 м. бікфордава шнура, а штабы інжынерных войскаў Прыбалтыйскага і 3-х Беларускіх франтоў выдзелілі 30 000 капсулёў-дэтанатараў і 10 000 м. бікфордава шнура [8, арк. 1-1адв].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Да 20 красавіка ўсе каманды прыступілі да размініравання. У першую чаргу пачалі размініраваць палі, каб сяляннe, калгасы і саўгасы змаглі прыступіць да першай пасляваеннай сяўбы. Не меньшая ўвага надавалася размініраванню адміністрацыйных будынкаў, у якіх пачалі размяшчацца органы партыйна-савецкай улады, гаспадарчыя арганізацыі, навучальныя, культурныя ўстановы, школы і г.д. Напрыклад, 31 сакавіка 1944 г. у толькі што вызваленай Гомельскай вобласці ў Нова-Беліцы па вул. Вайкова, 70, камандай размінёраў быў праведзены агляд будынка, у якім ў падвальным памяшканні было абнаружана і абязшкодзена 20 кг. выбуховых рэчываў. Па выніках размініравання быў складзены акт, у якім пазначалася: “адзначаны будынак лічым магчымым здаць у эксплуатацыю” [10, арк. 124].

Адступаючыя немцы мініравалі ўсё, што маглі: палеткі, прыватныя дамы, грамадскія будынкі, дарогі, тэлеграфныя стаўбы, лугі, лясныя ўчасткі і г.д. Асаблівую небяспеку ўяўлялі сабой мінныя палі, якія займалі плошчу ад дзесяткаў да соцен гектар плошчы. Так, напрыклад, у Быхаўскім раёне Магілеўскай вобласці па стану на 1 чэрвеня 1945 г. мелася 11 мінных палёў, з якіх 8 – супрацьпяхотных і 3 – супрацьтанкавыя, агульнай плошчай 2305 га. [6, арк. 35]. Самае меньшае поле займала плошчу 80 га, найбольшае – 170 га.

На мінным полі ў 2-3 і болей радоў магло размяшчацца да некалькіх соцен мін.

Мінныя палі з'уляліся часткай абарончых рубяжоў, якія "выстраілі" немцы па тэрыторыі Віцебскай, Гомельскай, Магілеўскай і Палесскай абласцей. Агульная працягласць гэтага рубяжа складала 705 км з глыбінёй мінных палёў у 15-20 км. Дык вось, толькі на абарончым рубяжы плошча мінных палёў складала 11 650 км$^2$. На гэтых палях, па падліках ваенных налічвалася звыш 3,8 млн штук мін, з якіх 1,2 млн. – савецкія міны і каля 2,6 млн. – нямецкія [1 арк. 126].

Сталіца рэспублікі была літаральна нашпігавана рознымі выбуховымі прадметамі. Так, да жніўня 1944 г. у Мінску было абнаружана і размініравана фугасаў і авіябомб 3292 штукі, агульнай вагой 167 666 кг, знята мін розных канструкцый – 3573, выбуховых рэчаў – 45 057. У Доме ўрада размінёры абнаружылі і абезшкодзілі 183 авіябомбы, 1950 кг. узрыўчаткі, 3800 гранат, у будынку ЦК КП(б)Б выбуховых рэчываў – 1300 кг., Доме афіцэраў – 1270 артылерыйскіх снарадаў і мін, у тэатры оперы і балета 2000 авіябомб, 1800 фугасаў [1 арк. 32-33].

Значную пагрозу ўяўлялі міны-сюрпрызы, якія немцы ўстанаўлівалі паўсюды. Адной з такіх мін-сюрпрызаў з'яўлялася міна, замаскіраваная ў сярэдзіне стаўба электраліній. Міна знаходзілася ў ніжняй частцы стаўба і мела ўзрывацель, устаноўлены на абрыўное дзеянне. Пры перапільванні ці механічным пашкоджанні такіх замініраванных стаўбоў у любой кропцы да высаты паўтара метра ад зямлі праходзіў узрыў [5, арк.104].

Упершыню немцы прымянілі такога роду міны ў Літве, а потым і ў Беларусі. Гэтыя міны-сюрпрызы было вельмі цяжка абнаружыць, таму ад іх гінулі людзі і ў наступныя гады. Так, напрыклад, 23 студзеня 1946 г. у Лепельскім раёне былі забіты двое рабочых-сувязістаў, якім не ўдалося абнаружыць гэтую міну-сюрпрыз. У пэўнай ступені тут была віна і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

размінёраў, якія на гэтым участку дорогі размініравалі 9-ць стаўбоў з такімі мінамі, а вось дзесяты аказаўся смяротным для людзей [5, арк. 156].

Першай з усіх абласцей амаль поўнасцю была размініравана Гомельскя вобласць. І гэта невыпадкова. З яе пачалося вызваленне Беларусі ад нямецкіх захопнікаў і на яе тэрыторыі першымі пачаліся работы па размініраванню. 10 ліпеня 1944 г. абласны савет Гомельскага Асавіяхіма адзначаў, што “размініраванне ва ўсіх вызваленых раёнах завершана і тэрыторыя па акту перададзена органам мясцовай улады. Не размініраванымі раёнамі Гомельскай вобласці засталіся Стрэшынскі, Рагачоўскі і Жлобінскі раёны, з-за іх непоўнага вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў” [10, арк. 171адв]. На 10 ліпеня 1944 г. па Гомельскай вобласці, за выключэннем адзначаных раёнаў было вышукана і сабрана 117 419 мін розных сістэм, сабрана і падарвана снарадаў, авіябомб і іншых выбуховых прадметаў 46 473 адзінкі, прагледжана на мініраванне 328 населенных пунктаў [10, арк. 171адв]. Восенню 1944 г. былі поўнасцю размініраваны астатнія тры раёны, у якіх было знойдзена і абезшкодзена 77 415 мін, знойдзена і падарвана 16 473 снарады, авіябомбы, гранаты і іншыя выбуховыя рэчы. У сукупнасці па ўсіх раёнах Гомельскай вобласці было абезшкоджана 194 834 міны розных сістэм, абезшкоджана і ўзарвана 62 946 снарадаў, авіябомб і іншых выбуховых прадметаў. Агульная колькасць гэтых небяспечных прадметаў склала 257 780 адзінак [10, арк. 170, 171адв, 172, 172 адв ]. Адзначым, што з Гомеля каманды размінёраў “перакідаліся” ў тыя вобласці, раёны і гарады, дзе работа па размініраванню працягвалася. Так, з Гомеля ў Мінск была перакінута каманда ў колькасці 25 мінераў, для размініравання сталіцы рэспублікі. Яна праверыла 13 аб’ектаў, размініравала 2-а мінныя палі, сабрала і падарвала 1208 снарадаў і мін [8, арк.2].

Якія ж былі вынікі размініравання за 1944 г. ? Усяго з вясны па снежань 1944 г. было падрыхтавана 528 інструктараў і 6639 байцоў-размінёраў, аб’яднаных ў 124 раённыя каманды, якімі было праверана, размініравана і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ачышчана ад небяспечна выбуховых прадметаў тэрыторыя ў 52 138 км². Поўнасцю была размініравана і здадзена па акту прадстаўнікам мясцовых органаў улады тэрыторыя 52 раёнаў рэспублікі. Сумесна з воінскімі часткамі каманды Асавіяхіма размініравалі 2584 мінныя палі на плошчы 973 км². Было абнаружана і ўзарвана 1 905 618 выбуховых прадметаў, сабрана 10 143 вінтоўкі, 897 – аўтаматаў, 767 – кулямётаў, 38 – мінамётаў. Поўнасцю была ачышчана тэрыторыя ў 52 раёнах, пры чым гэтая тэрыторыя перадавалася мясцовым органам улады па акту. Але калі ўзнікалі пытанні ў мяцовага кіраўніцтва, то праводзілася паўторная поўная, ці частковая праверка гэтай тэрыторыі [8, арк.4].

Размініраванне не абходзілася без чалавечых ахвяр. Так, з моманту размініравання і да канца 1944 г. загінула 70 і было паранена 95 размінёраў. Гінулі не толькі асобныя байцы-размінёры, але ў асобных выпадках і поўнасцю аддзяленні. Так, 4 ліпеня 1945 г. каля вескі Вялікі Трасцянец аддзяленне размінёраў праводзілі сбор мін. Раптоўна, увечары адбыўся мацнейшы выбух, у выніку якога адразу ж былі забіты ўсе 7 размінераў, а таксама калгасны сторож, які падыйшоў да байцоў. Як паказала расследванне, выбух адбыўся ў выніку неасцярожнага складзіравання мін, для іх далейшай вывазкі і знішчэння[11 арк. 142].

Адзначым, што дзяржава не аставіла ва ўмовах ужо пасляваеннага часу сем'і загінуўшых размінёраў сам-насам з бядой. Так, пастановай ДКА СССР аб 19 верасня 1944 г. №6564 "Аб распаўсюджванні пенсій ваеннаслужачых радавога і малодшага начальствуючага склада тэрміновай службы і іх сямей на асабовы склад раённых каманд Асавіяхіма на час іх працы ў камандах па размініраванню і збору трафеяў", прадугледжвалася, што сем'ям загінулых і параненых размінёраў выплачвалася пенсія і дапамога ва ўстаноўленым дзяржавай парадку [2 арк. 52].

Страты мірнага насельніцтва былі значна большымі. За 1944 г. загінула 1022 і было паранена 868 чалавек мірнага насельніцтва [9 арк. 36]. Людзі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нідзе не адчувалі сябе ў небяспецы – ні на палетках, ні на сенажацях, ні ў лесе, ні ў дамах.  Галоднае лета 1945 г. вымушала многіх жыхароў хадзіць у лес па грыбы і ягады. У ліпені 1945 г. 5 жанчын в. Ляскавічы Петрыкаўскага раёна Палесскай вобласці насабіраўшы ў лесе ягад вярталіся дамоў. Пры выхадзе з лесу на дарогу адна з іх незаўважыўшы міны-расцяжкі зачапіла расцяжку. Вынік трагічны – адна загінула адразу ж, чацвёра аказаліся цяжка параненымі [6 арк. 46].

Гінулі не толькі дарослыя, але і дзеці. Так, у інфармацыі, накіраванай сакратару ЦК КП(б)Б па ідэалогіі Цімоху Гарбунову у красавіку 1945 г. паведамлялася, што “на Камуністычнай вуліцы ў 20.00 у Мінску адбыўся ўзрыў супрацьтанкавай гранаты, якую знайшлі дзеці. Пацярпела 5 дзетак: 1 быў забіты, 4-ы цяжка параненыя” [11 арк. 91].

Паўсядзенная і вельмі рызыкоўная праца мінёраў, якія не мелі права на памылку, адзначалася і  ўрадавымі ўзнагародамі. Так, 5 студзеня 1945 г. загадам №1 ЦС Асавіяхіма СССР знакам “Выдатны мінёр” у Беларусі былі ўзнагароджаны 19 размінёраў з Гомельскай вобласці [3 арк. 168]. 7 чэрвеня гэтага ж года гэтым пачэсным знакам было ўжо ўзнагароджана з усёй рэспублікі 38 чалавек [12 арк. 30-32]. Акрамя гэтага ганаровага знака мінеры узнагароджваліся і высокімі ўрадавымі наградамі. Так, за выдатную працу па размініраванню толькі ў 1944 г. было прадстаўлена да ўзнагароды ордэнам “Чырвонай Зоркі” 8 чалавек, медалем “За адвагу” – 7, “За баявыя заслугі” – 3, “За працоўную доблесць” – 8 [10 арк. 171].

Другі этап пачаўся і працягваўся ўвесь 1945 г. У 1945 г. праца па размініраванню, асабліва ў заходніх абласцях - Баранавіцкай, Гродзенскай, Маладзечненскай, Пінскай, часткова Мінскай, працягвалася. Гэта тлумачылася тым, што каманды Асавіяхіма ў гэтых абласцях пачалі стварацца толькі восенню 1944 г. і не паспелі размініраваць іх тэрыторыю. Да таго ж, у 1945 г. прыходзілася часткова праводзіць пераправерку ўжо размініраваных раёнах. Гэта абумоўлівалася недобрасумленнасцю праведзенай раней работы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Так, напрыклад, па справаздачах Асавіяхіма Палескай вобласці вынікала, што тэрыторыя вобласці была поўнасцю размініраваная ў 1944 г. Але ў выніку пераправеркі было абнаружана 20 мінных палёў, а складзіраваныя боепрыпасы і іншыя небяспечна выбуховыя прадметы належным чынам не ахоўваліся і не знішчаліся [8 арк. 8адв].

Улічваючы такое становішча 3-4 студзеня 1945 г. у ЦС Асавіяхіма БССР была праведзена нарада, на якой былі падсумаваны вынікі працы ў 1944 г. і вызначаны планы па размініраванню на 1945 г. 6 сакавіка 1945 г. СНК БССР прыняў пастанову аб далейшым размініраванні тэрыторыі рэспублікі, у адпаведнасці з якой прадугледжвалася: правесці кантрольныя праверкі на тэрыторыі 43 064 км$^2$, а на тэрыторыі 598 км$^2$ правесці поўную і дэталёвую праверку. Усяго было запланавана праверыць і размініраваць 43 663 км$^2$ тэрыторыі [8 арк. 10адв]. Праца павінна была распачацца ў красавіку і скончыцца ў ліпені 1945 г. Гэтая тэрыторыя пераважна ўключала лугі, лясы і балоты. Акрамя гэтага, неабходна было знішчыць баяпрыпасы, якія не паспелі знішчыць у 1944 г. Як вынікае, у 1945 г. трэба было пераправерыць, праверыць і ачысціць амаль такую ж тэрыторыю, як і ў 1944 г. Найбольшы аб'ем работ павінна было выканаць у Гродзенскай і Бабруйскай абласцях, дзе праца ў 1944 г. з-за розных прычын практычна не праводзілася.

Вясной 1945 г. абласветы Асавіяхіма зноўку пачалі падрыхоўку неабходнай колькасці інструктароў і размінераў для хутчэйшага размініравання тэрыторыі рэспублікі. Да канца красавіка было перападрыхтавана і падрыхтавана 442 інструктары і 7651 размінёр, якія прыступілі да выканання пастаўленых урадам рэспублікі задач.

Размініраванне тэрыторыі ў 1945 г. мела і свае асаблівасці. Так, паводле пастановы СНК БССР ад 6 сакавіка ў 18 раёнах – Полацкім і Расонскім Полацкай: Віцебскім, Гарадоцкім, Дубровенскім, Лёзненскім, Мехаўскім, Сіроцінскім, Суражскім – Віцебскай: Рагачоўчкім, Жлобінскім, Стрэшынскім – Гомельскай; Парыцкім – Бабруйскай: Дамачаўскім, Капаткевіцкім –

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Палесскай абласцей размініраванне павінна было праводзіцца сапёрна-інжынерымыі войскамі Беларускай ваеннай акругі і імі ж передаваць праверанця і размініраваныя тэрыторыі мясцовым органам улады. 965размінёраў Асавіяхіма ў гэтых жа абласцях павінны былі дапамагаць ваенным [8 арк. 10адв]. У астатніх раёнах размініраванне павінны былі праводзіць каманды Асавіяхіма. Адзначым і аддадзім належнае і ваенным, і камандам Асавіяхіма якія не дзялілі тэрыторыю на “сваю” і “чужую”, а працавалі зладжана, прыходзілі адзін аднаму на дапамогу. Так, ваенныя размінёры  правялі найбольш складаную частку працы ў шэрагу раёнаў Мінскай і Маладзечненскай абласцей па размініраванню мінных палёў і падрыве вялікай колькасці баяпрыпасаў. У Мінскай вобласці імі было размініравана 24 мінныя палі на плошчы ў 54 га, знішчана 19 698 мін, акрамя гэтага было падарвана 173 534 адзінкі выбуховых прадметаў. У Маладзечненскай вобласці было размініравана 8 мінных палёў[8 арк. 13-1адв].

На працягу вясны-восені 1945 г.  ва ўсіх абласцях каманды Асавіяхіма закончылі працу. Яна была ўнушальная. Так, 578 інструктараў і 6997 размінёраў, аб’яднаных у 183 раённыя каманды за красавік-кастрычнік 1945 г. праверылі і ачысцілі ад баяпрыпасаў і размініравалі  56 821км$^2$ тэрыторыі рэспублікі, у тым ліку тэрыторыі, на якой не было абнаружана выбухованебяспечных прадметаў 38 608 км$^2$, і тэрыторыі, на якой праводзілася размініраванне – 18 213 км$^2$. Было размініравана 355 мінных палёў на плошчы 120,2 км$^2$. У 1945 г. было праверана 12 976 населеных пунктаў, у тым ліку размініравана  і ачышчана ад баяпрыпасаў 872 населеныя пункты.

На праверанай  тэрыторыі было знішчана:  на мінных палях – 600 947, а на палявых зборных пунктах (ПЗП)  - 120 856 усіх відаў і тыпаў мін. У 1945 г. было знішчана шляхам падрыву 6 230 715 адзінак  усіх відаў баяпрыпасаў (авіябомб, снарадаў, мінаметных мін), якія былі сабраны размінёрамі. Акрамя гэтага было знішчана 453 756 адзінак баяпрыпасаў, якія захоўваліся на ПЗП

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

яшчэ з 1944 г. Такім чынам, у пабедным 1945 г. было абнаружана, размініравана і знішчана найбольшая колькасць боепрыпасаў, за ўвесь час працы размінёраў.

Размінёры сабралі і здалі ў гэтым жа годзе райваенкаматам 800 вінтовак і карабінаў, 105 аўтаматаў, 57 ручных і станкавых кулямётаў і іншую зброю. На месцах было астаўлена як металалом 290 гармат, 515 танкаў і 466 трактараў, якія не належылі рамонту [8 арк. 15].

І ў 1945 г. не абыйшлося без чалавечых ахвяр. Пры выкананні заданняў 43 разы гучалі выбухі, якія вялі да гібелі і раненняў. 12 інструктараў і 25 размінёраў загінулі, а 8 інструктараў і 29 размінёраў атрымалі раненні. Усяго было забіта 37 і паранена 37 чалавек. Размінёрскі матрыралог па абласцях быў наступны: Віцебская вобласць – загінула 6, паранена – 10; Гомельская адпаведна 5 і 5; Мінская 9 і 1; Магілеўская – 6 і 4; Полацкая – 4 і 2; Бабруйская – 3 і 4; Палесская – 3 і 2; Брэсцкая – 6; Пінская – 2 параненыя; Баранавіцкая – 1 забіты; Гродзенская -1 забіты; Маладзечненская – 1 паранены [8 арк. 15].

Страты сярод мірнага насельніцтва былі больш унушальнымі. За 1945 г. па ўсёй рэспубліцы загінула 733 і было паранена 1079 чалавек. Пры тым, 60% ад усёй колькасці загінулых і параненых прыпадала на дзяцей[8 арк.17].

Аднак і ў 1945 г. не ўдалося поўнасцю ачысціць тэрыторыю рэспублікі ад нямецкіх "падарункаў" у выглядзе мін, снарадаў і іншых выбуховых рэчываў і прадметаў. Так, напрыклад, у снежні 1945 г. на тэрыторыі Віцебскай вобласці мелася неабязшкодзеннымі 69 мінных палёў, агульнай плошчай 2499 км$^2$ [7 арк. 155].

Трэці этап характарызуецца тым, што абота па размініраванню тэрыторыі рэспублікі парацягвалася з пачатку 1946 г. і была скончана толькі восенню 1946 г. За гэты перыяд праводзілася пераправерка і канчатковая ачыстка тэрыторыі, якая лічылася недастаткова размініраванай. Аб'ёмы працы былі ўжо значна меньшымі. За вясну – восень 1946 г. каманды Асавіяхіма праверылі 1698 км$^2$ тэрыторыі, на якой было абнаружана 305 349

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выбухованебяспечных прадметаў, з якіх 15 549 з’яўляліся супрацьтанкавымі і супрацьпяхотнымі мінамі, а астатнія – снарады, авіябомбы, мінаметныя міны і інш [8 арк. 20адв.].

Работа праведзеная размінёрамі была ўнушальная. Так, за красавік 1944 – верасень 1946 гг. з агульнай тэрыторыі рэспублікі ў 196 659 км$^2$ пераважна камандамі размінёраў было праверана, размініравана і ачышчана 109 099 км$^2$. Было абнаружана 3556 мінных палёў, з якіх інжынерна-ваеннымі часткамі было размініравана 438 палёў, а камандамі Асавіяхіма – каля 600. Разам – ваенныя і размінёры Асавіяхіма размініравалі 2348 палёў. Размінерамі было праверана 18 879 населеных пунктаў, з якіх размініравана 1847.

На праверанай тэрыторыі было абнаружана розных мін 1 746 661, з якіх было знішчана 1 539 663, а 30 998 было перададзена воінскім часткам і райваенкаматам. Таксама было абнаружана 8 082 886 адзінак снарадаў, мінаметных мін, авіябомб, гранат, з якіх падарвалі 8 043 471 адзінку, а 39 415 передалі ў райваенкаматы і воінскія часткі. На падрыў гэтых “адзінак” было пушчана 29,9 т. выбуховых рэчываў, 141 557 капсуляў і дэтанатараў, 75,6 км бікфордавага шнура.

Каманды асавіяхіма сабралі і передалі ваенкаматам і воінскім часткам 10 943 карабіны, 1002 аўтаматы, 524 кулямёты, 85 мінамётаў, 68 супрацьтанкавых ружжаў, 12 рэвальвераў. У якасці металалому заставалася на палях для далейшай утылізацыі 337 гармат, 533 танкі, 474 трактары, 3653 аўтамашыны.

Усю гэтую працу правялі 1000 інструктараў-размінёраў і 14 280 байцоў размінераў. Яны размініравалі і ачысцілі ад выбуховых прадметаў 109 099 км$^2$ тэрыторыі, на якой было сабрана і знішчана 9 838 883 розных выбухованебяспечных прадметаў, у тым ліку 1 746 661 розных мін [13 арк. 42].

Пасляваенная Беларусь выходзіла з вайны са страшнымі людзкімі стратамі. Колькасць насельніцтва не перавышала пяці з паловай мільёнаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

чалавек. Гэта значыць, што амаль на кожнага жыхара рэспублікі – ад немаўляткі да знямоглага старога прыходзілася ледзьве не дзве міны. Жудасная статыстыка.

За гераізм і мужнасць 88 інструктароў і байцоў-размінёраў былі узнагароджаны знакам ”Выдатны мінёр”, 73 былі атрымалі граматы ЦС Асавіяхіма БССР, больш як за 1500 чалавек атрымалі грашовыя прэміі ад 300 да 1000 рублеў, значная колькасць людзей атрымалі каштоўныя падарункі [8 арк. 20-24].

Большасць размінераў з’яўляліся беларусамі. Але побач з імі былі і прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей, якія партызанілі ў рэспубліцы, а потым засталіся тут жыць і працаваць. Сярод іх былі марыец Султан Ішмурзін, украінец Рыгор Броўчанка, рускі Пётр Гарбачоў, беларус Сцяпан Маёўскі і іншыя прадстаўнікі колішніх брацкіх рэспублік, якія сваёй працай, сваімі намаганнямі ачысцілі беларускую зямельку ад тоячайся ў яе нетрах жалезнай смерці.

У незалежнай і суверэннай Рэспубліцы Беларусь шмат рабілася і робіцца для мемарыялізацыі подзвіга беларускага народа ў Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнах. У бронзе, бетоне, шматлікіх мемарыяльных шыльдах, на сусветна вядомых мемарыльных комплексах і сціплых вясковых могілках увекавечана памяць салдат, партызан, падпольшчыкаў. Але ў Беларусі няма ніводнага, нават сціплага помніка, мемарыяльнай шыльды байцам-размінёрам, якія зрабілі ўсё магчымае і немагчымае, каб на кожнага беларуса – ад немаўляткі да знямоглага старога не прыпадала ніводнай міны.

Незалежная і суверэнная Беларусь ужо рыхтуецца да 70-цігоддзя Перамогі. Напэўна ўладным структурам напярэдадні 70-цігоддзя Перамогі савецкага, у тым ліку і беларускага народа ў Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнах, трэба не забыць, а лепей прыняць рашэнне аб увекавечанні памяці байца-размінёра.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Літаратура і крыніцы


1. НАРБ, ф.4п, воп. 37, спр.185. Перапіска з ЦК ВКП(б)Б. 1 студзеня 1946-31 снежня 1946 г.
2. НАРБ, ф.263, воп.2, спр.73. Планы, акты, загады, палажэнне і данясенні аб работах па размініраванню тэрыторыі БССР. 12 кастрычніка – 13 снежня 1944 г.
3. НАРБ, ф.263, воп.2, спр.70. Характарыстыкі, аўтабіяграфіі, спіскі лепшых размінёраў тэрыторыі БССР. 20 мая 1944 г. – 27 сакавіка 1946 г.
4. НАРБ, ф.263, воп.2, спр.82. Акты, планы, указанні і праграмы аблсаветаў Асавіяхіма па размініраванню тэрыторыі БССР. Т.1. 8 студзеня – 10 красавіка 1945 г.
5. НАРБ, ф.263, воп.2, спр.84. Акты, планы, указанні і праграмы аблсаветаў Асавіяхіма па размініраванню тэрыторыі Беларусі. Т.3. 10 чэрвеня – 12 снежня 1945 г.
6. НАРБ, ф.263, воп.2, спр.80. Планы, данясенні і акты аблсаветаў Асавіяхіма БССР па размініраванню тэрыторыі БССР. 9 красавіка – 20 кастрычніка 1945 г.
7. НАРБ, ф.263, воп.2, спр.92. Загады, палажэнні, праграмы, справаздачы і данясенні па размініраванню. Т.1. 19 студзеня 2 ліпеня 1945 г.
8. НАРБ, ф.4п, воп.37, спр.202. Справаздача аб размініравання тэрыторыі Беларусі. 1944-1946 гг.
9. НАРБ, ф.4п, воп.37, спр. 135.
10. НАРБ, ф.263, воп.2, спр.72. Планы, звесткі, данясенні, акты і ўказанні аб рабоце па размініраванню тэрыторыі БССР. 1 студзеня 29 верасня 1944 г.
11. НАРБ, ф.4п, воп. 47, спр.44. Зводкі і інфармацыі на імя сакратара ЦК КП(б)Б Гарбунова. Студзень – снежань 1945 г.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

12. НАРБ, ф.263, воп.2, спр.183. Копіі пастаноў ЦС Асавіяхім СССР і характарыстыкі да іх па ўзнагароджанню работнікаў сістэмы Асавіяхіма БССР. 30 студзеня 1945 г. 8 чэрвеня 1945 г.
13. НАРБ, ф.4п, воп.37, спр.189. Дакладныя запіскі ў ЦК ВКП(б) об працы ваеннага аддзела ЦК КП(б)Б. Справаздача ваеннага аддзела ЦК КП(б)Б. 1 студзеня 1947 г. – 31 снежня 1947 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ